# На 96-м годзе жыцця памёр Яфрэм Сакалоў

## Ён быў адным з апошніх фактычных кіраўнікоў БССР

**Яфрэм Яўсеевіч Сакалоў нарадзіўся 25 красавіка 1926 года ў вёсцы Равячына Горацкага раёна. Працоўную дзейнасць пачаў рабочым, шафёрам. З 1956 года — галоўны аграном Плотніцкай МТС Столінскага раёна, у маі таго ж года прызначаны дырэктарам Дружылавіцкай МТС. Потым працаваў начальнікам райсельгасінспекцыі.**



Затым была работа на цаліне ў Паўладарскай вобласці Казахскай ССР, на пасадзе першага сакратара Урлюцюбскага райкама партыі. З 1965 года — старшыня Брэсцкага абкама прафсаюза рабочых і служачых сельскай гаспадаркі і нарыхтовак. У 1967 годзе абіраецца першым сакратаром Іванаўскага райкама КПБ.

Талент дзяржаўнага дзеяча і кіраўніка раскрыўся ў Я. Я. Сакалова на вышэйшых пасадах савецкага часу. З 1977 года ён быў першым сакратаром Брэсцкага абкама КПБ. Пад яго кіраўніцтвам Брэсцкая вобласць узяла высокія рубяжы ў сваім развіцці. Я. Я. Сакалоў меў заслужаны аўтарытэт і павагу жыхароў вобласці. І не толькі. Па перадавы вопыт да брастаўчан прыязджалі дэлегацыі з усіх куткоў Савецкага Саюза. Ён быў адзіным партыйным функцыянерам, хто атрымаў званне Героя Сацыялістычнай Працы за час кіравання Гарбачова.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы